**Беларуская мова**

Тэма урока: План тэксту

Мэты урока: пазнаёміць з роляй плана тэксту, фарміраваць уменне складаць план тэксту пры дапамозе пытальных і апавядальных сказаў; развіваць лагічнае мысленне, звязнае маўленне навучэнцаў; выхоўваць міралюбівасць

**ХОД УРОКА**

**I.Арганізацыйны момант.**

Праверка арганізацыі працоўнага месца, пажаданне добрага настрою, поспехаў у працы.

Праверка дамашняга задання

Арфаграфічная хвілінка.

Прачытаць жарт. Уставіць прапушчаныя літары.

Бацька купіў сыну прыгожы ру..зак і кажа:

Гля..і, Міколка, каб ты кожны дзень прыносіў поўны ру..зак дзясятак.

А куды ж я буду кні..кі класці?

Прыдумаць і запісаць словы, якія пачынаюцца на кожную літару слоўнікага слова рукзак

Р____________

У____________

К____________

З____________

А__________ __

К____________

Чыстапісанне.

РрР ру ра ор

Слоўнікавая работа.

Гульня “Шыфравальшчыкі”. Работа ў парах: чоура нікруч закрук (учора ручнік рукзак)

Паўтарэнне правапісу галосных гукаў пасля цвёрдых зычных.

Вучні запісваюць словы, ставяць націскі, вусна складваюць словазлучэнні і сказы.

**ІІ. Паўтарэнне вывучанага матэрыялу.**

Работа па варыянтах

***1 варыянт.***

Прачытаць тэкст. Злучыць стрэлкамі часткі з іх назвамі.

| | |
|---|---|
| У траве дзеці ўбачылі баравік. | Канцоўка |
| Такога велікана і зрэзаць шкада. | Асноўная частка |
| У яго была карычневая шляпка. | |
| Ножка высокая і тоўсценькая. | Пачатак |
| Ён быў увесь такі важны. | |

***2 варыянт.***

Прачытаць сказы. Скласці з іх тэкст. Вызначыць тэму. Адшукаць пачатак, асноўную частку і канец.

Аднойчы каля асіны мы ўбачылі прыгожы маленькі грыбок. Мама сказала, што гэта падасінавік, таму што ён расце пад асінай. Мы з мамай часта ходзім у лес. У

гэты дзень мы знайшлі многа сыраежак, лісічак і нават баравікі. З іх атрымаўся смачны грыбны суп.

**III. Вывучэнне новага матэрыялу.**

Гульня ”Што атрымалася?“

Прачытаць тэму ўрока, засяроджваючы ўвагу толькі на падкрэсленых літарах.

Праблемнае пытанне: для чаго патрэбен план тэксту?

Планаванне работы ”Што трэба зрабіць, каб правільна саставіць план тэксту?“

-Уважліва прачытаць тэкст.

Вызначыць яго тэму.

Адшукаць пачатак, асноўную частку і канцоўку.

Вызначыць тэму кожнай часткі.

Абазначыць пункты плана ў выглядзе пытанняў, сказаў ці асобных слоў.

Запісаць план у сшытак.

**Работа па падручніку**

Чытанне тэксту.

Гутарка па змесце. Суаднясенне загалоўка з асноўнай думкай тэксту (практыкаванне 47, с.29-30).

Знаёмства з роляй плана тэксту ў працэсе азнаямлення з інфармацыяй рубрыкі ”Завяжы вузялок!“ (с. 30).

Складанне і запіс плана тэксту.

Падзел тэксту на часткі з апорай на серыю малюнкаў.

Падбор загалоўка да кожнай часткі тэксту і складанне плана з апавядальных сказаў (практ. 48, с. 30)

Якія малюнкі вы ўяўляеце, калі чыталі тэкст?

Якая тэма тэксту?

Знайдзіце пачатак, асноўную частку і канцоўку.

Што трэба зрабіць, каб пераказаць тэкст? (Скласці план)

Прачытайце першую частку. Якія словы можна запісаць, каб запісаць першы пункт плана?

Прачытайце другую частку. Аб чым аўтар расказвае ў ёй?

Што галоўнае аўтар хацеў паказаць у апошняй частцы (канцоўцы)?

**IV. Замацаванне ведаў.**

Чытанне тэксту.

Гутарка па змесце.

Падзел тэксту на часткі.

Пастаноўка пытання да кожнай часткі тэксту і складанне плана з пытальных сказаў (практ. 49, с. 31).

Знаёмства з рознымі спосабамі складання плана тэксту ў працэсе азнаямлення з інфармацыяй рубрыкі ”Завяжы вузялок!“ (с. 31)

Развіццё маўлення.

Скласці са слоў сказы. Запісаць іх.

Павуцінне, плыве, павольна, белае.

Восень, залатая, прыйшла.

**V. Падвядзенне вынікаў.**

На картках зроблены запісы. Але вецер-жартаўнік раскідаў карткі.

Пранумараваць карткі, каб атрымаць адказ на пытанне ”Як скласці план тэксту?“

Запісаць план.

Раздзяліць тэкст на сэнсавыя часткі.

Даць загаловак кожнай частцы.

Вызначыць, што ў кожнай частцы самае галоўнае.

Уважліва прачытаць тэкст.

**VI. Рэфлексія.**

У мяне сёння атрымалася…

У мяне атрымалася не зусім добра…

У выкананні заданняў мне дапамагло (перашкаджала)…

**VII.Дамашняе заданне:**

Практыкаванне 50

**VIII. Вынік**